Reformation

# «Я расказваю і пра тое, што цяпер адбываецца ў калоніях і турмах»: мастачка Марына Напрушкіна аб сваёй выставе ў Берліне




**Марына Напрушкіна** – беларуская палітычная мастачка і актывістка, якая жыве і працуе ў Берліне.

Этот сайт использует cookie для хранения данных. Продолжая использовать сайт, Вы даете свое согласие на работу с этими файлами. OK

Звычайна аўтарка рэалізуе свае праекты па-за межамі інстытуцый, у супрацы з супольнасцямі і арганізацыямі актывістаў. Напрыклад, у 2007 годзе Марына Напрушкіна заснавала Офіс антыпрапаганды, у якім яго ўдзельнікі аналізавалі механізмы палітычнай прапаганды, арганізоўвалі і падтрымлівалі палітычныя кампаніі. Пасля выбараў 2010 года Марына стварала палітычныя коміксы, дзе распавядала, як развіваліся падзеі ў Беларусі пасля прэзідэнцкіх выбараў. Палітычныя рэпрэсіі, валютны і эканамічны крызіс, тэракт у метро апісваўся ў дзвюх версіях – афіцыйнай і незалежных СМІ.

У 2013 годзе мастачка распачала ініцыятыву па стварэнні супольнасці людзей па дапамозе ўцекачам «Новае суседства/Маабіт» (Берлін).

Цяпер у Берліне (да 20 студзеня) працуе выстава Марыны Напрушкінай пад назвай «Птушкі з народам». Назва паўтарае лозунг, з-за якога была закрытая адна з найстарэйшых прыродаахоўных арганізацый Беларусі «Ахова птушак Бацькаўшчыны».

Аўтарка паказвае складаную, шматслойную гісторыю беларускай рэвалюцыі і руху сацыяльнай салідарнасці, які пачаўся ў 2020 годзе. Гэта аповед аб практыцы рэпрэсій і гвалту, якія ажыццяўляюцца беларускім рэжымам не толькі на ўзроўні дысцыплінарных інстытутаў, але і пранізваюць тканіну паўсядзённай практыкі з дапамогай палітыкі, прымусовай працы і спажывання.

Пагаварылі з Марынай Напрушкінай пра канцэпты і сэнсы яе выставы.

Этот сайт использует cookie для хранения данных. Продолжая использовать сайт, Вы даете свое согласие на работу с этими файлами.



Фрагмент экспазіцыі выставы Марыны Напрушкінай. На першым плане выява тыпавога будынка адной са школ, у якіх часта размяшчаюцца выбарчыя ўчасткі. Фота прадастаўлена аўтаркай.

**– Гэта выстава рэалізуецца ў канве вашых ранейшых практык, але спасылкі, якія вы выкарысталі ў сваім праекце, для вас нехарактэрныя – стылістыка народнага дывана і авангарднага руху УНОВІС. Як вы гэта ўсё спалучаеце ў адной прасторы?**

– Маляваныя дываны, «маляванкі», былі шырока распаўсюджаныя ў вёсках Беларусі, Польшчы і Украіны ў першай палове мінулага стагоддзя, яны існавалі адначасова са школай УНОВІС 1920-х гадоў, якая была заснавана ў віцебскім авангардным вучылішчы.

Гэтыя дзве з'явы развіваліся поруч, аднак адна з іх увайшла ў гісторыю сусветнага мастацтва, а другая доўгі час лічылася маргіналізаваным

Этот сайт использует cookie для хранения данных. Продолжая использовать сайт, Вы даете свое согласие на работу с этими файлами.

працай.



Этот сайт использует cookie для хранения данных. Продолжая использовать сайт, Вы даете свое согласие на работу с этими файлами.




Твор Марыны Напрушкінай «Ой, рэчанька-рэчанька, Чаму ж ты ня поўная?» закранае тэму гвалтоўнай меліярацыі. Фота прадастаўлена аўтаркай.

**– Стылістычна гэта спалучэнне чытаецца ў творах, а тэматычна? Якія тэмы, якая праблематыка ўздымаецца ў вашай выставе?**

– У першым пакоі выставы я размяшчаю серыю шырокафарматных двухбаковых маляваных дываноў, якія расказваюць пра нядаўнюю гісторыю пратэснага руху ў Беларусі: антыўрадавыя выступленні 2020 года і паступовае паглынанне Расіяй Беларусі з пачатку вайны ва Украіне. Гэта гісторыя закранае і закрыццё недзяржаўных арганізацый і палітычных партый, а таксама высокую колькасць палітычных зняволеных.

З аднаго боку, мы бачым выяву, якая вельмі моцна нагадвае «маляванку» паводле сваёй канструкцыі. Ёсць цэнтр з нейкім цэнтральным сюжэтам, ёсць

Этот сайт использует cookie для хранения данных. Продолжая использовать сайт, Вы даете свое согласие на работу с этими файлами.

адваротнага боку «маляванак» я змяшчаю тэксты песень, якія спявалі падчас пратэстаў 2020 года.

Выкарыстанне народных песень варта ўспрымаць як практыку дэкаланізацыі, таму што мы звяртаемся да народнай традыцыі, а не да акадэмічных ведаў.

Яшчэ адна тэма – наша цела як асноўны інструмент супраціву. Бо ў вобразе рэвалюцыі ёсць шмат рацыянальнага, але мала гаворыцца пра тое, што адбываецца з нашым целам, а яно насамрэч захоўвае намнога больш памяці і з-за гэтых усіх працэсаў вельмі моцна мяняецца.

Таму на выставе ёсць выявы жаночых целаў.



Этот сайт использует cookie для хранения данных. Продолжая использовать сайт, Вы даете свое согласие на работу с этими файлами.




Марына Напрушкіна. FR4978. Палатно, акрыл. 2023. Фота прадастаўлена аўтаркай.

Супрэматычныя кампазіцыі руйнуюць плаўнае апавяданне, звязанае з наіўным мастацтвам «маляванак», ператвараючы выставу ў трывожную гісторыю, у цэнтры якой ляжыць аналіз эксплуатацыі жаночай працы з дапамогай практык прымусу і сістэмнага прыгнёту.

Я расказваю і пра тое, што зараз адбываецца ў калоніях і турмах. У прыватнасці, у Гомельскай папраўчай калоніі № 4 утрымліваюцца жанчыны-палітвязні і многія з іх займаюцца шыццём.

Этот сайт использует cookie для хранения данных. Продолжая использовать сайт, Вы даете свое согласие на работу с этими файлами.



Марына Напрушкіна. Дзяржаўнае прадпрыемства № 4. Палатно, акрыл. 2023. Фота прадастаўлена аўтаркай.

Сярод вырабаў, якія яны шыюць, працуючы па 10-12 гадзін у дзень, – форма для супрацоўнікаў Міністэрства ўнутраных спраў, якія здзяйсняюць гвалт у дачыненні да зняволеных і з’яўляюцца ключавой апорай рэжыму. А таксама – хакейная форма — любімы від спорту **Лукашэнкі**, і сувенірная прадукцыя з вышыванкамі, за якія людзі могуць быць затрыманыя, калі іх зловяць у грамадскім месцы. Тым не менш яны там вырабляюцца і прадаюцца замежнікам.

Акрамя гэтага, калонія вырабляе прадметы штодзённага ўжытку, такія як пасцельная бялізна, коўдры і падушкі, што азначае, што прымусовая праца зняволеных, з аднаго боку, непрыкметная, а з іншага боку, інтэграваная ў паўсядзённае жыццё. Многія з вырабаў, створаных зняволенымі, экспартуюцца не толькі ў Расію, але і ў Еўропу і Кітай, што робіць гэтую эксплуатацыю часткай сусветнай эканомікі.

Этот сайт использует cookie для хранения данных. Продолжая использовать сайт, Вы даете свое согласие на работу с этими файлами.

**– У творы, прысвечаным папраўчай калоніі № 4, – камяні. Якім чынам яны звязаны з тэмай рэпрэсій і гвалту?**

– Я часта чытаю сваім студэнтам верш беларускай паэткі **Юліі Цімафеевай** «Камень страху», ён пра страх, які перадаецца ад пакалення да пакалення, пра замоўчванне сістэмнага гвалту. Камень у гэтым вершы захоўвае непрыемную спадчыну, з’яўляецца носьбітам нявыказаных гісторый і эмоцый, бо ў каменя няма рота, ён не можа ні крычаць, ні казаць. Таксама мой твор пра тое, што камень можа з’яўляцца зброяй.

**– Вы на сваёй выставе быццам сумяшчаеце будучае і цяперашняе, традыцыю і утопію…**

– Хутчэй я падхопліваю праекцыю будучага з мінулага стагоддзя і ўпісваю ў яе сённяшнія рэаліі. Уяўленне пра будучае зыходзіць з таго, што ў нас цяпер адбываецца. Таму я застаюся ў кантэксце сучаснасці.

Яшчэ я паказваю моманты супраціўлення жорсткай палітычнай рэчаіснасці, якая не ўзнікла сёння, а складалася гадамі. Таму гляджу на гэта праз дэкаланіяльную і феміністычную оптыку.

Этот сайт использует cookie для хранения данных. Продолжая использовать сайт, Вы даете свое согласие на работу с этими файлами.




Фрагмент экспазіцыі выставы Марыны Напрушкінай. Фота прадастаўлена аўтаркай.

**– Чаму вы, з аднаго боку, даяце такія жорсткія карціны рэчаіснасці, а з іншага – народныя лірычныя песні? Гэта наша «мяккая сіла»?**

– Гэта форма ведаў і перадачы досведу.

**– На першы погляд, стратэгія аказалася непаспяховай…**

– Калі разглядаць гэту стратэгію ў больш шырокіх часавых рамках, то высновы будуць іншыя. Мая выстава не ставіць пад пытанне стратэгіі супраціву. Але лічу важным гэтую стратэгію задакументаваць… і працягваць.

Этот сайт использует cookie для хранения данных. Продолжая использовать сайт, Вы даете свое согласие на работу с этими файлами.

– Мая работа заснавана на перасячэнні актывісцкіх практык і мастацтва. Напрыклад, мой тэкст 2020 года «Я хачу жанчыну-прэзідэнтку» не абавязкова павінен быць размешчаны ў выставачнай прасторы. Ён функцыянуе ў іншых інфармацыйных сетках.




Этот сайт использует cookie для хранения данных. Продолжая использовать сайт, Вы даете свое согласие на работу с этими файлами.

Маляваныя дываны падобныя на сцягі, калі ісці з супрацьлеглага боку і глядзець на словы песняў. Таму яны з'яўляюцца формай, што знаходзіцца паміж аб'ектам выставачным і аб'ектам актывісцкім. Яны не на падрамніках, іх можна ўзяць у рукі і пайсці з імі на вуліцу. Як і плакаты, яны могуць па-іншаму цыркуліраваць, не ў выставачнай прасторы. Тэкст, напісаны на палатне, можа існаваць як флаер. Гэтыя рэчы важныя для мяне.

Этот сайт использует cookie для хранения данных. Продолжая использовать сайт, Вы даете свое согласие на работу с этими файлами.



Фрагмент экспазіцыі выставы Марыны Напрушкінай. Фота прадастаўлена аўтаркай.

Этот сайт использует cookie для хранения данных. Продолжая использовать сайт, Вы даете свое согласие на работу с этими файлами.

– З аднаго боку, так. Аднак сама рэчаіснасць, у якой жывем і дзе не можам дзейнічаць па-іншаму, робіць гэтыя працы палітычнымі.

Падпісвайцеся на культурныя навіны Reform.by у Telegram

Если вы нашли ошибку, пожалуйста, выделите фрагмент текста и нажмите *Ctrl+Enter*.

**Мы будем благодарны за поддержку нашей работы донатом.**

https://reform-by.cdn.amppro Скопировать ссылку доступа без VPN

## Последние новости

01:25 **Святочная прэм'ера ад Зміцера Вайцюшкевіча – відэа «Каляднае танга» ў стылістыцы малюнкаў на шкле – так званых, «відзікаў»**

22:02 **Ордеры на международный розыск, санкции, коммуникации в МУС – Представительство ОПК по транзиту власти подвело итоги года**

21:30 **Россия нанесла более 6 ударов по центру Харькова**

21:05 **«Свята будзе!» – Полк Калиновского поздравил с Новым годом и показал свой рецепт драников**

20:23 **В МАРТ рассказали о новой системе регулирования цен: ходить за согласованием не придется, но и хаотичного роста не будет**

19:47 **Украина определила военную стратегию на следующий год**

19:19 **Жалобу на приговор главному редактору «Рэгіянальнай газеты» рассмотрят 23 января**

19:00 **«За час існавання мы напісалі больш за 3000 лістоў». Паглядзіце, як праходзяць сустрэчы ініцыятывы «Лісты палітвязням» – і**

Этот сайт использует cookie для хранения данных. Продолжая использовать сайт, Вы даете свое согласие на работу с этими файлами.